УДК 947.6«18/19»

У. М. Сцебурака, аспірант

# ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў СІСТЭМЕ МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ ПАСЛЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 Г. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ)

The article contains information about problems of governing in Belarus after the February revolution of 1917.

Пасля адмовы імператара Мікалая II ад трону 2 сакавіка 1917 г. найвышэйшая ўлада ў краіне стала належаць Часоваму камітэту Дзяржаўнай Думы, які «...узяў у свае рукі стварэнне нармальных умоў жыцця і кіравання ў сталіцы і заклікаў дзейсныя войскі і флот захоўваць поўны спакой...» [1, с. 3].

У першыя ж дні працы Часовы ўрад выдаў шэраг указаў, накіраваных на стабілізацыю і паляпшэнне жыцця грамадства і стану дзяржавы. Асобна стаяць указы, што мусілі зменшыць напружанасць у грамадстве, выкліканую злоўжываннямі царскіх чыноўнікаў, рэпрэсіўнай дзейнасцю судовага і паліцэйскага апарату.

Сярод найбольш заўважных адзначым наступныя: 7 сакавіка 1917 г. была абвешчана ўсеагульная палітычная амністыя [2, с. 346], 16 сакавіка выйшаў указ «Аб ліквідаванні Найвышэйшага крымінальнага суда і асаблівых прысутнасцей Кіруючага Сената, судовых палат і акруговых судоў з удзелам саслоўных прадстаўнікоў» [2, с. 353], больш за тое – пры міністры юстыцыі стваралася надзвычайная следчая камісія, якая павінна была правесці даследаванні па супрацьзаконнай дзейнасці былых міністраў і іншых вышэйшых службовых асоб царскай адміністрацыі [2, с. 354].

Змены закранулі і пенітэнцыярную сістэму Расіі: 12 сакавіка 1917 г. было адменена смяротнае пакаранне [2, с. 570], 17 сакавіка былі скасаваны для ссыльнапасяленцаў і арыштантаў пакаранне розгамі, накладанне кайданоў і апрананне змірыцельнай кашулі [2, с. 571], далей выйшлі загады па войску і флоту, што вызначылі парадак перагляду спраў, вырашаных ваенна-палявымі судамі [2, с. 585], і іх скасаванне ў мясцовасцях, што не ўваходзяць у тэатр баявых дзеянняў [2, с. 586] і інш.

Пастанова ад 26 красавіка 1917 г. «Аб некаторых зменах у арганізацыі цэнтральнага ўпраўлення месцамі зняволення» зацвердзіла наступныя змены: Галоўнае Турэмнае ўпраўленне было перайменавана ў Галоўнае Упраўленне месцамі зняволення, а Савет па Турэмных справах – у Савет па справах месцаў зняволення. Пры гэтым начальнік Галоўнага Упраўлення месцамі зняволення з'яўляўся адначасова і старшынёй Савета. Сам Савет складаўся з дзевяці членаў і памочнікаў старшыні. Савет разглядаў усталяванне месцаў зняволення і стан утрымання; паляпшэнне гаспадаркі і кіравання месцамі зняволення; праекты смет; справаздачы па дзейнасці; пытанні апекі зняволеных. Акрамя таго, пры Галоўным Упраўленні існаваў асобы Урачэбна-санітарны савет [1, с. 205].

Пастановай ад 10 сакавіка 1917 г. скасоўваўся дэпартамент паліцыі і стваралася Часовае ўпраўленне па справах грамадскай паліцыі [1, с. 27], а ўжо 17 красавіка выйшаў указ «Аб утварэнні міліцыі» [1, с. 185].

Царская паліцыя на мясцовым узроўні будавалася наступным чынам. Вышэйшай паліцэйскай уладай на ўзроўні губерні быў губернатар [8, с. 284]. Свае паліцэйскія ўпраўленні меліся ва ўсіх паветах. Паветы ў сваю чаргу падзяляліся на станы, якімі кіравалі станавыя прыставы, пасада якіх была ўведзена яшчэ ў 1837 г. [10, с. 424]. Станавыя прыставы прызначаліся непасрэдна губернскім начальствам і кандыдаты на пасаду абіраліся пераважна з ліку мясцовых дваран, што мелі маёмасць у межах губерні [9, с. 56].

Станавыя прыставы вырашалі ўсе справы выканаўчага, следчага, судова-паліцэйскага і гаспадарча-распарадчага кшталту. На практыцы гэта азначала, што прыстаў мусіў займацца ўсім – ад прыпынення боек у прысутных месцах і арганізацыі сялянства ў барацьбе з драпежнымі жывёламі да збору інфармацыі аб відах на ўраджай у наваколлі. Прыстаў быў падуладны павятоваму паліцэйскаму ўпраўленню і з'яўляўся выканаўчым чыноўнікам. Улада прыстава распаўсюджвалася таксама на мястэчкі і беспавятовыя гарады. На прыступку ніжэй стаялі памочнікі станавога прыстава – паліцэйскія ўраднікі, пасада якіх была ўведзена пастановай ад 9 чэрвеня 1878 г. [11, с. 944].

Ураднікі не мелі права складаць пратаколы, займацца пераследам вінаватых па шэрагу спраў, звязаных з парушэннем законаў аб гандлі, будаўніцтве і інш. А павінны былі толькі інфармаваць аб заўважаных злоўжываннях свайго начальніка, станавога прыстава. Іх асноўная ўвага была засяроджана на ахове грамадскага спакою, і пры гэтым яны мелі права спыніць масавы сход і нават арыштаваць падазроных у крымінальным злачынстве.

У самым нізе паліцэйскай іерархіі знахо-дзіліся соцкія і дзесяцкія. Гэта агенты сельскай паліцыі, якія выконвалі загады прыстава і зай-маліся непасрэдным наглядам за парадкам. Соцкія кантралявалі 100–200 двароў і былі вы-барнымі асобамі з сялянскага асяродка. Па сут-насці, гэта была павіннасць, ад якой не можна было адмовіцца. Соцкія выконвалі распара-джэнні земскага суда, прыстава і іспраўніка, сачылі за санітарнымі нормамі ў вёсцы, за суп-рацьпажарнай бяспекай і збіралі звесткі пра ўсе надзвычайныя здарэнні лакальнага характару [12, с. 943].

Функцыі соцкіх і ўраднікаў шмат у чым дубліраваліся.

Старая паліцыя была тым прадстаўніком дзяржавы, што меў найбольш цесны што-дзённы кантакт з народам. Паліцыя ў Расіі бы-ла фактычна выканаўцам усіх распараджэнняў вышэйшых органаў улады, і таму яна мела су-тыкненне з усімі бакамі жыцця чалавека. Расійская паліцыя не толькі выконвала ролю ахоўніка парадку, але і з'яўлялася органам фіскальнага ведамства, а таксама за адсутнас-цю судовай паліцыі выконвала часткова і ролю следства. Паліцыя была пасрэднікам паміж усімі органамі ўлады і насельніцтвам. Яна была і органам дзяржаўнай статыстыкі, збіраючы каштоўны матэрыял для дзяржавы [6, с. 178], часам робячы гэта негалосна і не-афіцыйна, як у выпадку збору інфармацыі пра запасы фуражу ў землеўласнікаў Мінскай гу-берні па сакрэтным запыце князя Туманава ў 1917 г. [7, с. 32–36].

Акрамя старога паліцэйскага апарату, быў скасаваны і інстытут жандармерыі, якім з 1882 г. кіраваў намеснік міністра ўнутраных спраў [13, с. 559]. Уся імперыя падзялялася на восем жандарскіх акруг. А сама жандармерыя існава-ла ў выглядзе палявых жандарскіх эскадронаў, што неслі ваенна-паліцэйскую службу ў раёнах размяшчэння войск у мірны і ваенны час, і так-сама як асобны корпус жандараў. Ён у сваю чаргу складаўся з галоўнага ўпраўлення, штаба, губернскіх, гарадскіх і абласных упраўленняў, асобых аддзяленняў па ахове грамадскай бяспе-кі, жандарскіх паліцэйскіх упраўленняў чыгун-кі і іх аддзяленняў, крэпасных і партовых ка-манд, трох жандарскіх дывізіёнаў (у Петраграа-дзе, Маскве і Варшаве) і Адэскай коннай жан-дарскай гарадской каманды.

Жандары выконвалі абавязкі выканаўчай паліцыі: візіравалі пашпарты, забяспечвалі бяс-пеку на транспарце, даследавалі дзяржаўныя злачынствы, ажыццяўлялі пошук і нагляд за дзяржаўнымі злачынцамі, утрымлівалі іх пад аховай.

У распараджэнні жандараў былі тайныя агенты палітычнага вышуку і выведкі. Іх да-нясенні служылі падставай для пастаноў аб карных мерах – высылцы без суду і г. д. [6, с. 186].

Без характарыстыкі жандараў не адбывала-ся ніводнага прызначэння на дзяржаўныя паса-ды, а «ахоўныя аддзяленні» жандараў наогул былі вольнымі ад кантролю мясцовай адміністрацыі і ўмешваліся ў справы паліцыі.

Дарэчы і жандары часам нават пасля фар-мальнага скасавання іх інстытута працягвалі выконваць звыклую працу на карысць дзяржа-вы, нягледзячы на недвухсэнсоўны загад Часо-вага ўрада спыніць усялякую дзейнасць. Гэтак начальнік Магілёўскага губернскага жандар-скага ўпраўлення, палкоўнік Яленскі хаця і за-гадаў 4 сакавіка сваім падначаленым спыніць палітычны росшук, арышты і назіранні на прадмет выяўлення недабранадзейнасці сярод насельніцтва, але прапанаваў працягваць «вы-святленне агітатараў падпольнага руху супраць вайны, мець усебаковае назіранне за рабочымі, што абслугоўваюць прадпрыемствы, якія пра-цуюць на патрэбы абароны, у сэнсе папярэ-джання злаўмысных забастовак з мэтай падар-ваць узброеныя сілы арміі, а гэтаксама мець назіранне за войскамі ў сэнсе сувязі іх з агітатарамі супраць вайны» [16, с. 21].

З пастановамі Часовага ўрада і гэты адыёз-ны інстытут сышоў у нябыт.

На гэтым грунце паўставала новая міліцыя Часовага ўрада.

Агульнае кіраванне міліцыяй ажыццяўляў міністр унутраных спраў. Ён жа выдаваў інст-рукцыі і вызначаў тэхнічны бок дзейнасці міліцыі. Міністэрству ўнутраных спраў нале-жала і назіральная функцыя, а таксама і праца па складанні смет на ўтрыманне міліцыі. У гу-бернях уводзіліся пасады інспектараў міліцыі, якія валодалі правам нагляду і кантролю.

Пабудова новага апарату пачалася па паста-нове «Аб стане павятовай і гарадской міліцыі», дзе тлумачыліся асновы дзейнасці і структура новага інстытута [1, с. 186].

У дакуменце, у прыватнасці, адзначалася, што ўвесь павет з павятовымі і беспавятовымі гарадамі падначалены ведамству павятовай земскай міліцыі.

Быў вызначаны яе склад:

1) начальнік міліцыі;

2) яго памочнікі;

3) участковыя начальнікі міліцыі і іх па-мочнікі;

4) старэйшыя міліцыянеры;

5) міліцыянеры.

Адзначалася, што пры начальніку павятовай і гарадской міліцыі існуюць: канцылярыя на ча-ле з сакратаром, рассыльныя, памяшканне для арыштантаў і архіў. Пры ўчастковых на-чальніках – канцылярыя і пастарунак. Выдаткі па ўтрыманні міліцыі ўскладаліся і на Міністэрства ўнутраных спраў, і на мясцовыя

органы самакіравання ў выглядзе гарадскіх дум і павятовых земскіх сходаў. Грошы на міліцыю з Дзяржаўнага казначэйства перадаваліся ў іх распараджэнне на месцах [1, с. 185]. Да склікання Устаноўчага сходу вызначэнне складу, колькасці і акладаў павятовай міліцыі і служачых канцылярый (за выключэннем акладу начальніка павятовай міліцыі) ускладалася на павятовыя земскія ўправы. Дарэчы, аклады захоўваліся ў памерах, вызначаных на ўтрыманне чыноў паліцыі па пастанове ад 23 кастрычніка 1916 г. [1, с. 185].

Усе чыны міліцыі павінны былі насіць вызначаны ўзор формы і быць узброенымі халоднай зброяй і рэвальверамі.

Начальнікі міліцыі, роўна як і іх памочнікі, абіраліся і звальняліся гарадскімі і павятовымі земскімі ўправамі, але апошнія прадстаўляліся ўправам самім начальнікам міліцыі. Усе астатнія чыны міліцыі прызначаліся па асабістым меркаванні начальніка і памочнікаў. Наогул, міліцыянерам мог стаць грамадзянін Расіі не маладзейшы за 21 год. Былі абгавораны і пункты, па якіх грамадзянін не меў права стаць міліцыянерам. Гэта наяўнасць судзімасці, з часу адбывання якой не прайшло пяці гадоў, стан запазычанасці пры неплацежаздольнасці, знаходжанне пад следствам і судом, утрыманне дамоў цярплівасці і інш. [1, с. 187]. Меўся і адукацыйны цэнз: начальнік павятовай міліцыі і яго памочнікі павінны былі мець адукацыю ні ніжэй за сярэднюю, для астатніх чыноў дастаткова было і простай пісьменнасці.

Асобны IV раздзел пастановы «Аб стане павятовай і гарадской міліцыі» пад назвай «Аб прадметах, якія падлягаюць кантролю і ступені ўлады» рэгламентуе саму працу міліцыі. Асноўнай задачай міліцыі ў шырокім сэнсе ёсць ахова грамадскай бяспекі і парадку. А ў прыватнасці, міліцыя павінна:

1) прымаць меры, каб прадухіліць парушэнне закону;

2) абвяшчаць насельніцтва аб распараджэннях і пастановах урада і ўлад;

3) ахоўваць грамадзянскія свабоды;

4) садзейнічаць органам урада і грамадскім уладам у выкананні ўскладзеных на іх абавязкаў;

5) выдаваць пасведчанні, даведкі і г. д.;

6) весці ўлік насельніцтва;

7) складаць пратаколы і акты аб рознага кшталту няшчасных выпадках і гвалтоўных дзеяннях;

8) забяспечваць парадак у прысутных грамадскіх месцах: ахоўваць і сачыць за належным станам дарог, мастоў, вуліц і г. д.;

9) захоўваць парадак пры пажарах, паводках і інш.;

10) садзейнічаць грамадзянам пры няшчасных выпадках і інш.

Акрамя гэтага, на міліцыю ўскладаліся пэўныя абавязкі па справах судовых устаноў: правядзенне дазнанняў і ўдзел у папярэднім следстве па крымінальных справах; удзел па справах грамадскага абвінавачвання; прадстаўленне суду абвінавачаных і ўтрыманне іх пад аховай; выклік па позве ў суд, удзел у выканні судовых прысудаў; абавязкі па нагляду за перасылкай арыштантаў. Сярод іншых спецыфічных абавязкаў міліцыі адзначым: улік і прызыў асоб у войска і флот; паведамленне сваякам аб смерці вайскоўцаў; інфармаванне ваенных улад аб знаходжанні на падуладнай тэрыторыі салдатаў з пратэрмінаваным адпачынкам [1, с. 189].

Міністэрства ўнутраных спраў у маі 1917 г. выдала пастанову, якая загадвала ўсім былым паліцэйскім чынам, якія пакінулі скасаваныя пасады, з'явіцца ў прызыўныя пункты, каб прайсці агляд камісіі і папоўніць шэрагі ваеннаслужачых рэгулярнага войска [3, с. 41]. Загады разышліся па губернях і паступова пачалі прыводзіцца ў дзеянне. У пачатку сакавіка 1917 г. у Мінску ўнутраная паліцыя была заменена на грамадзянскую міліцыю і быў створаны спецыяльны Часовы гарадскі камітэт з выканаўчай часткай для заведвання справамі міліцыі [14, с. 82]. Уся справа ішла пад наглядам галоўнакамандуючага Заходнім фронтам [4, с. 14]. У Мінску 3 сакавіка пасля абмеркавання тэлеграмы, якая прыйшла з Петраграда на адрас губернскай управы і гарадской думы, кіраўнікі апошніх Б. М. Самойленка і С. Б. Хржанстоўскі прыйшлі да пагаднення аб усталяванні ў горадзе часовага грамадскага органа для падтрымкі спакою і парадку [17]. На сходзе з удзелам каля 70 чалавек пад старшынствам Б. М. Самойленкі былі выказаны прапановы: «усталяваць Камітэт грамадскай бяспекі, абраць грамадзянскага каменданта для загадвання паліцыяй і міліцыяй і прасіць галоўнакамандуючага зацвердзіць камітэт і каменданта». Па прапанове С. Б. Хржанстоўскага грамадзянскім камендантам быў абраны Б. М. Самойленка [17]. Было вырашана, што за думай застанецца выкананне толькі гаспадарчых функцый, а Камітэт грамадскай бяспекі павінен узяць у свае рукі толькі частку – утварэнне міліцыі і зносіны з ваеннай уладай. Акрамя таго, было пастаноўлена асігнаваць 1000 руб. на арганізацыю міліцыі і заклікаць жыхароў горада ахвяраваць сродкі на яе [18, с. 23].

Арганізацыя парадку была даручана М. А. Міхайлаву. Тут жа на сходзе быў распачаты запіс служачых у міліцыю [18, с. 15].

4 сакавіка адбыўся агульны сход служачых і рабочых Усерасійскага земскага саюза. Паводле пастановы зноў абранага выканкама, на базе гэтай арганізацыі ўтварылася гарадская міліцыя. У гэты ж дзень грамадзянскі камендант

Б. М. Самойленка абвясціў загад аб прызначэнні М. А. Міхайлава «часовым начальнікам міліцыі УЗС па ахове парадку ў горадзе», загадаўшы таксама «гарадскім чынам паліцыі выдаць Міхайлаву зброю, якая маецца ў іх распараджэнні, па вопісу» [18, с. 15].

На працягу 4 сакавіка ў горадзе сіламі міліцыі былі заняты паліцэйскае ўпраўленне, ахоўны і вышуковы аддзелы і амаль усе паліцэйскія пасты. Паліцэйскія чыны перадалі зброю міліцыі Усерасійскага земскага саюза, якая ўзяла ўсе ўрадавыя ўстановы, пошту, тэлеграф пад сваю ахову. У той самы дзень адбылася нарада з удзелам Б. М. Самойленкі, С. Б. Хржанстоўскага, І. І. Віткевіча, некаторых членаў Камітэта грамадскай бяспекі, а таксама мінскага паліцмайстара А. А. Лебяды з нагоды ўтварэння ў горадзе міліцыі. Было вырашана фарміраваць яе з гараджан з часовым уключэннем чыноў паліцыі, але «з разборам па рэкамендацыі жыхароў і падпарадкаваннем яе грамадзянскаму каменданту» [17].

Удзень 5 сакавіка адбылося пасяджэнне Камітэта гарадской бяспекі. Было пастаноўлена прыняць міліцыю, арганізаваную Усерасійскім земскім саюзам, за асноўнае ядро для ўтварэння агульнагарадской міліцыі і звярнуцца да насельніцтва з адозвай аб запісе ў яе [19, с. 112]. Гэта пытанне было даручана спецыяльна створанай камісіі на чале з В. А. Янчэўскім [19]. Запіс добраахвотнікаў пачаўся ў той жа дзень.

14 сакавіка было абвешчана «Часовае палажэнне аб Мінскай гарадской міліцыі», распрацаваны гарадскім Камітэтам грамадскай бяспекі дакумент падкрэсліваў поўнае падначаленне яе названаму камітэту. Неўзабаве пасля абвяшчэння дакумента Камітэт грамадскай бяспекі пастанавіў ачысціць міліцыю ад былых паліцэйскіх, зазначыўшы, што яны «ні на якую гарадскую службу прымацца не будуць».

У гэты ж час займаецца стварэннем міліцыі і віцебскі камісар Карташоў [4, с. 15]. У Віцебску 4 сакавіка адбылося сумеснае пасяджэнне думы з удзелам начальніка Дзвінскай ваеннай акругі, генерала Зуева, губернатара Хітраво, чыноўнікаў земства, прадстаўнікоў дваранства і інш. Генерал і губернатар публічна абвясцілі аб сваей прыхільнасці новаму ўраду [18, с. 1]. Галосныя думы ўзялі на сябе працу па стварэнні часовага органа ўлады «дзеля усталявання ў горадзе парадку, спакою і аховы асобы і маёмасці». Са свайго складу імі была вылучана рабочая група з 10 чалавек на чале з гарадскім галавой Вегліным [18, с. 19]. У ліку першаступенных былі намечаны мерапрыемствы па раззбраенні паліцыі, арышту варожых элементаў, канфіскацыі архіваў, арганізацыі народнай міліцыі, утварэнні харчовай і юрыдычнай секцый, а таксама па ўпарадкаванні сходаў і мітынгаў [18, с. 2]. У выніку былі сфарміраваны адпаведныя секцыі: народнай міліцыі (старшыня М. М. Гніларыбаў), харчовая (Е. Ф. Алонаў), судовая (Я. Г. Юдзін), рэдакцыйная (Р. Я. Арансон), а таксама па арганізацыі насельніцтва, па арганізацыі сходаў і мітынгаў [18, с. 48–49].

6 сакавіка адбылося трэцяе пасяджэнне пад старшынствам А. А. Валковіча. Прысутныя ўхвалілі праект стварэння гарадской міліцыі, складзены М. М. Гніларыбавым. Было вырашана звярнуцца да паліцэйскага кіраўніцтва аб працягу выканання іх абавязкаў да канчатковага вырашэння пытання аховы горада [20, с. 2].

Такім чынам, нягледзячы на хуткае заканадаўчае вырашэнне пытання з міліцыяй, практычнае ўтварэнне новай структуры сутракалася са шматлікімі складанасцямі. Узнікалі пытанні рознага кшталту: так, невельскі павятовы камісар Танжэўскі пытаўся ў губернскага пра тое, хто павінен старшынстваваць на сходзе па перафарміраванні паліцыі [4, с. 20], полацкі павятовы камісар высвятляў, ці захоўваць штат паліцэйскай канцылярыі і як выдаваць заробкі [4, с. 35], у тым жа Невелі было не зразумела, каму старшынстваваць у павятовай вайсковай прысутнасці замест арыштаванага спраўніка [4, с. 37]. Не ўсё ладна было і са скасаваннем старой паліцыі. Нярэдкія былі выпадкі незаконных арыштаў чыноў паліцыі і іншыя гвалтоўныя дзеянні супраць іх [4, с. 41], [15, с. 33]. Ліквідацыя пастарункаў часам суправаджалася абяззбройваннем паліцэйскіх, разгромам будынкаў і вызваленнем зняволеных без разбору [3, с. 37], [3, с. 324].

Міліцыя з цяжкасцю ўладкоўвалася і забяспечвалася ўсім неабходным. Складанасці былі часам нават з атрыманнем належнай ёй па законе зброі. Прынамсі мінскай міліцыі зброя выдавалася Артылерыйскім упраўленнем за грошы (!). Але і пры гэтым прадаваліся толькі рэвальверы «Наган» і старыя вінтоўкі сістэм Ветэрлі і Маўзера, «трохлінейкі», якія міліцыя мела, яна павінна была здаць на патрэбы войска [5, с. 80].

А тым часам 29 мая 1917 г. да абавязкаў міліцыі дадаліся яшчэ і функцыі нагляду за выкананнем збору падаткаў і іншых плацяжоў. Прыцягвалася міліцыя і для барацьбы з дэзерцірствам [5, с. 84].

З пераліку функцый міліцыі зразумела, што абсяг дзейнасці яе быў блізкі да таго, што мела царская паліцыя. І па-іншаму быць не магло, бо грамадства паўсюдна патрабуе ад падобных органаў улады аднаго і таго ж – забеспячэння аховы парадку і грамадскай бяспекі.

У выніку цяжка сцвярджаць, што замена паліцыі міліцыяй неяк паўплывала на саму сістэму выканаўчай улады Міністэрства

унутраных спраў. У старыя будынкі ўехалі новыя людзі, якія часта былі мала знаёмыя са спецыфікай працы і не ўносілі якасных пераўтварэнняў у працу. З іншага боку, быў аднoўлены крэдыт даверу насельніцтва да гэтага інстытута, бо многія старыя службоўцы, што неаднаразова паспелі скампраментаваць сябе, былі звольнены, а на іх месцы прыйшлі людзі з народа, якія яшчэ не паспелі запляміць свой вобраз. Так ці інакш ліквідацыя паліцыі і стварэнне міліцыі стала адным з найбольш заўважных пераўтварэнняў Часовага ўрада на раннім этапе яго дзейнасці, пераўтварэнне, якое было з большага прыязна і станоўча ўспрынята грамадствам.

### Літаратура


1. Сборник указов и постановлений Временного правительства (27 февраля 1917 года – 5 мая 1917 года). – Петроград, 1917. – Вып. I.
2. Собрание узаконений и распоряжений Временного правительства. – Петроград, 1917. – Т. 1.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 622. Воп. 1. Спр. 2. Л. 41.
4. НАРБ. Ф. 622. Воп. 1. Спр. 4. Л. 14.
5. НАРБ. Ф. 616. Воп. 1. Спр. 1. Л. 80.
6. Слиозберг Г. Б. Дореволюционный строй России. – Париж, 1933.
7. НАРБ. Ф. 640. Воп. 1. Спр. 1. Л. 32–36.
8. Ерошкин Н. П. История государственных учреждений дореволюционной России. – 2-е изд. – М., 1968.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Сборник законов о губернаторах и генерал-губернаторах, извлеченных из всех томов Свода законов (кроме Т. 2).
10. Становой пристав // Энциклопедический словарь: В 86 т. / Сост. Брокгауз Ф. А., Эфрон К. А. – СПб., 1890–1907. – Т. 31. – 1900.
11. Урядники полицейские // Энциклопедический словарь: В 86 т. / Сост. Брокгауз Ф. А., Эфрон К. А. – СПб., 1890–1907. – Т. 35. – 1902.
12. Сотский // Энциклопедический словарь: В 86 т. / Сост. Брокгауз Ф. А., Эфрон К. А. – СПб., 1890–1907. – Т. 30. – 1900.
13. Жандармы // Энциклопедический словарь: В 86 т. / Сост. Брокгауз Ф. А., Эфрон К. А. – СПб., 1890–1907. – Т. 17. – 1897.
14. Великая Октябрьская Социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. – Мн., 1957. – Т. 1.
15. Рудовіч С. Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. – Мн., 2001.
16. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 21.
17. Минский голос. – 1917, 5 марта.
18. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 23.
19. Минский голос. – 1917, 6 марта.
20. НАРБ. Ф. 626. Воп. 1. Спр. 1. Л. 2.